Министерство образования Республики Беларусь

Белорусский государственный педагогический университет
имени Максима Танка

*Факультет эстетического образования*

# ПЕДАГОГИКА ИСКУССТВА В ЦЕЛЯХ УСТОЙЧИВОГО РАЗВИТИЯ ОБЩЕСТВА

Международная научно-практическая конференция
г. Минск, 11 апреля 2024 года

# ПЕДАГОГІКА МАСТАЦТВА Ў МЭТАХ УСТОЙЛІВАГА РАЗВІЦЦЯ ГРАМАДСТВА

Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя
г. Мінск, 11 красавіка 2024 года

# PEDAGOGY OF ART FOR SUSTAINABLE DEVELOPMENT OF SOCIETY

International Scientific-Practical Conference
c. Minsk, April 11, 2024

*Научное электронное издание
локального распространения*

Минск
БГПУ
2025

*ISBN 978-985-29-0591-6*

*© Оформление. Белорусский государственный педагогический университет имени Максима Танка, 2025*

УДК 37.01:7
ББК 74.0:85
П24

Р е д к о л л е г и я:
*Шатарова М. А.* (отв. ред.), кандидат филологических наук, доцент кафедры теории и методики преподавания искусства, заместитель декана по научной работе факультета эстетического образования БГПУ;
*Захарина Ю. Ю.,* доктор искусствоведения, профессор, заведующий кафедрой теории и методики преподавания искусства БГПУ;
*Лойко Г. В.,* профессор, заслуженный деятель искусств Республики Беларусь, заведующий кафедрой художественно-педагогического образования БГПУ;
*Сернова Т. В.*, кандидат искусствоведения, доцент, заведующий кафедрой музыкально-педагогического образования БГПУ;
*Иванова М. В.*, кандидат педагогических наук, доцент, доцент кафедры музыкально-педагогического образования БГПУ;
*Дубатовская О. А.*, кандидат искусствоведения, доцент, доцент кафедры музыкально-педагогического образования БГПУ;
*Приймова М. Ю.,* доцент кафедры художественно-педагогического образования БГПУ

П24 **Педагогика** искусства в целях устойчивого развития общества = Педагогіка мастацтва ў мэтах устойлівага развіцця грамадства = Pedagogy of art for sustainable development of society : материалы Междунар. науч.-практ. конф., г. Минск, 11 апр. 2024 г. / Белорус. гос. пед. ун-т им. Максима Танка ; редкол. : М. А. Шатарова (отв. ред.) [и др.]. – Минск : БГПУ, 2025.
ISBN 978-985-29-0591-6.

В сборнике рассматриваются актуальные вопросы и перспективы развития художественно-эстетического образования.

Адресуется педагогам, аспирантам и студентам высших учебных заведений, всем, кого интересуют вопросы художественно-эстетического образования.

*Минимальные системные требования:*
Операционная система Windows 98 и выше Процессор Pentium III, RAM 32 Mb (ОЗУ),
HDD 250 Mb Видеоадаптер с разрешением 800×600, 256-цветов,
32 Mb видеопамяти, DVD-ROM, мышь

© Оформление. Белорусский государственный
педагогический университет имени Максима Танка, 2024

*Программное обеспечение:* Adobe Acrobat Reader

Издается в авторской редакции

Ответственный за выпуск *М. А. Шатарова*
Дизайн обложки *А. М. Романович*

Дата подписания к использованию . Mb. Тираж 5 электрон. экз. Заказ 102.

*Исполнение*: учреждение образования «Белорусский государственный педагогический
университет имени Максима Танка».
Ул. Советская, 18, 220030, Минск. https://bspu.by

# АДЛЮСТРАВАННЕ СВЕТАПОГЛЯДУ БЕЛАРУСАЎ У МАЛЯВАНЦЫ

М. А. Шчэцька, А. А. Коўрык, кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт
УА "Бларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт
імя Максіма Танка", Рэспубліка Беларусь

Анатацыя. У артыкуле разглядаецца культура маляваных дываноў як сімвал духоўна-маральных каштоўнасцей беларусаў. Вылучаюцца асобныя рысы, уласцівыя беларускай нацыі праз тэхнікі выканання, выявы, спосабы выкарыстання маляваных дываноў.

Ключавыя словы: маляваны дыван, светапогляд беларусаў, сімвалізм, інтэр'ер, побыт.

# REFLECTION OF THE WORLDVIEW OF BELARUSIANS IN MALYAVANKA

M. A. Shchetska, A. A. Kovrik, Candidate Of Art History (PhD),
Associate Professor
Belarusian State Pedagogical University named after Maxim Tank,
Republic of Belarus

Abstract. The scientific article considers the culture of the hand-drown carpets as a symbol of the spiritual and moral values of Belarusians. The special features inherent in the Belarusian nation are highlighted through techniques, images, and ways of using hand-drown carpets.

Keywords: hand-drown carpet, worldview of Belarusians, symbolism, interior, everyday.

Маляванка – адзін з галоўных сімвалаў беларускай культуры XX стагоддзя. Амаль у кожнай хаце можна было пабачыць адзін ці болей маляваных дываноў, якія ўпрыгожвалі сцены хат простых жыхароў вёсак. Людзі замаўлялі дываны перад вяселлямі ці іншымі важнымі святамі, укладаючы пэўныя зычэнні ў элементы, якія адлюстроўваліся на маляванцы. Часта маляванкі ствараліся мастакамі-жабракамі, якія вандравалі па вёсках і за часовае жытло і ежу аздаблялі цэлы населены пункт такімі творамі мастацтва. Гэта цікавы факт, бо людзі такога кшталту назіралі значна больш, мелі ўяўленне пра розныя лакальныя суполкі і бачылі асаблівасці побыту ў розных мясцінах. Гэта дапамагала больш дасканала прааналізаваць і адлюстраваць свет, які мроілі пабачыць людзі.

Выявы на маляваных дыванах мелі сваё сакральнае значэнне, свае сімвалы. Майстры выкарыстоўвалі прыгожыя прыродныя элементы: кветкі, травы, краскі – яны часта дадавалі дынаміку рабоце і служылі неад'емнай арнаментальнай часткай маляванага дывана. У асноўным кожная расліна мела сваё сімвалічнае значэнне, якое выкарыстоўвалася ў закладанні мэтавага кантэксту дывана. З прыходам прафесіянальных мастакоў да вырабу маляваных дываноў з'явіліся новыя формы кампазіцыі. Напрыклад, Язэп Драздовіч пазычыў, верагодна з мастацтва эпохі барока, медальёны, якія ахіналіся раслiннымі выявамі, як аснову кампазіцыі

шматлікіх сваіх дываноў. Па сутнасці сваёй раслінны свет заўсёды заставаўся самай прываблівай часткай навакольнага свету беларусаў. Старажытнай традыцыяй беларускіх сялян з’яўляецца культура стварэння палісаднікаў, кветнікаў, адкуль расліны і перайшлі ў шыкоўны свет маляваных дываноў. Раслінныя матывы сустракаюцца ва ўсіх праявах народнай творцасці: вышыўка, роспісы, ткацтва і інш. Беларусы не адасаблялі сябе ад прыроды. Прыроду яны лічылі неадрыўнай часткай сваёй асабістасці, што спрыяла працягламу культу зямлі і захаванню шматлікіх паганскіх абрадаў і традыцый, якія былі цесна звязаны з прыродай.

Не меньш важным сімвалам шматлікіх маляваных дываноў станавіліся “райскія” жывёлы. Самыя распаўсюджаныя прыклады – гэта тыповыя выявы льва, аўтарства Алены Кіш. Аднак не трэба думаць, што толькі яна выкарыстоўвала гэты старажытны сімвал у сваіх творах. Многія майстры стваралі вобраз магутнага звера, толькі не драпежніка-забойцу, як прынята ў сусветнай культуры, а волата-ахоўніка. Ганебнасць, якая панавала ў свядомасці беларусаў таго часу, стварала надзею на волата, які павінен прыйсці і дапамчы свайму народу, абараніць ад страшнай навалы. Такія матывы выразна прасочваюцца ў песнях, казках, выяўленчай творчасці. Такое светаўяўленне ўласціва беларускаму народу, як і імкненне не вытыркацца ў многіх пытаннях, нават калі яны датычацца іх саміх. На вясельных дыванах часта малявалі птушак, павернутых адна да адной, як сімвал вечнага кахання, і кветкі ці іншыя расліны, якія ахінаюць ці знаходзяцца ў тандэме з птушкамі і зычаць маладым квітнення і багацця.

Нярэдка на маляваных дыванах праглядваецца і хрысціянская сімволіка: рай, райскія жывёлы, лілеі, галубы, рыбы, рэлігійныя пабудовы і інш. Гэта сведчыць, што паганская культура на тэрыторыі сучаснай Беларусі мудрагелістымі карэннямі ўплілася ў каноны хрсціянства. Такі сімбіёз стварае featureразнабаковы погляд на жыццё: Бог адзін, але духі ёсць і да іх мы выказваем павагу, абразы пішуцца па нерухомым канонам, аднак дадаць элемент народнай творчасці ніхто не забароніць, мы жывем па грыгарыянскаму і юльянскаму каляндарах, але працягваем актыўна святкаваць паганскія святы такія, як Масленіца, Купалле, Дзяды. Такія ўступкі бачныя ва ўсіх сферах жыцця беларусаў. Мы працягваем плесці гэтыя бясконцыя клубкі спалучэння паганства і хрысціянства. Такія кантрасты культуры вызначаюць багаты духоўны свет нашай нацыянальнасці.

Нярэдка сустракалася і архітэктура на маляваных дыванах: палацы і замкі, шыкоўныя і таямнічыя, выглядваючыя з-за дрэваў. Гэтыя далёкія і блізкія тэмы для простага люду, гавораць нам пра такія зямныя і вечныя людскія мары і жаданні. Майстры, малюючы архітэктуру на маляванках, захоўвалі выгляд сваёй зямлі ў яе росквіце, калі нашы тэрыторыі квітнелі багаццем. Кожнаму пакаленню беларусаў хацелася захаваць частку свайго жыцця і побыту. Выдатнай глебай для гэтага станавіліся маляваныя дываны. Сёння мы дакладна можам уявіць сабе архітэктуру

таго часу, калі ствараліся пэўныя дываны, што павялічвае значнасць гэтага віду мастацтва.

Побытавыя сцэны таксама былі распаўсюджаныя, малявалі нават людзей. Частым сюжэтам былі маладыя хлопец з дзяўчынай у розных постацях, які безумоўна сімвалізуе доўгі сумесны шлях разам, бо для нашых продкаў шлюб быў важнай і непарыўнай сувяззю людзей. Выглядала гэта больш яскрава, чым адбывалася на самой справе, бо звонку хацелася бачыць сваё жыццё лепшым.

Навуковыя даследванні вызначылі дастаткова малады ўзрост такога накірунку народнай творчасці, як маляванка, аднак і за тыя паўстагоддзя існавання майстэрства валодання гэтым відам мастацтва здзіўляе. Мы бачым не проста прыклад народнага матсацтва, а вытанчаную работу свядомых аўтараў. З якой фенаментальнай дасканаласцю адлюстроўваліся асаблівасці тых ці іншых элементаў кампазіцыі, як выдатна часам прапрацавана свет-цень, паказана нават, хоць і ўмоўна, планавасць, перспектыва.

Часта ў рабоце над маляванкай выразаліся набойкі, што рабіла працу больш хуткай, але патрабавалася асаблівага навыку майстра. «Набіванка выконвалася пры дапамозе разьбяных дошак-клішэ. Такая дошка рэльефным малюнкам на яе ніжнім баку, на які наносілася фарба, накладвалася на тканіну, раскладзеную на стале з мяккім подсцілам, і прыстуквалася – «набівалася» драўляным малатком для лепшага адбітку малюнка. Адсюль і назва «набіванка» [2; 30]. Такая дасціпнасць у працы праяўляецца ў розных сферах дзейнасці беларусаў, у тым ліку ў мастацтве. Бачны цудоўныя назіральнасць і нагледжанасць. Гэта важныя навыкі для мастакоў і сёння.

Матэрыялам для маляванкі магло стаць усё, што знаходзілася пад рукой мастака: адрэз тканіны, пакрывала, часам нават цырата. Аднак жа на цёмным лепей вылучаецца святло, як і мары становяцца больш яскравымі, калі яны выплываюць з цемрадзі пакутлівага жыцця. Росквіт мастацтва маляванкі прыходзіцца на 30-50-я гады XX стагоддзя. Як вядома, гэта вельмі складаныя эканамічна, палітычна, тым больш сацыяльна часы. І менавіта тады імкненне да прыгажосці і надзеі на паляпшенне жыцця, на дасягнення раю на зямлі даходзіць піку. Як і ў любы цёмны час, на пачатку XX стагоддзя людзі, перажыўшы не адну катастрофу, цалкам згубіўшы баланс у жыцці праз дзяльбу зямлі і ўлады, імкнуліся стабілізаваць, хоць крыху, сваё эмацыйнае становішча. Гэта адбываецца не свядома, прыкладам таго стаецца інстынкт немаўляці, якое імкнецца само сябе люляць, калі няма побач маці, каб супакоіцца. Па таму ж прынцыпу беларусы, ад самых старажытных часоў, стваралі вакол сябе прыгажосць, якая запаўняла побыт, дапамагала палепшыць жыццё. Зразумела, нашыя продкі не ведалі тэорыю колеразнаўства, не разумелі, як уплывае колер на псіхіку чалавека, але назіранні дапамаглі ім выявіць, што яскравыя колеры ўзбуджаюць і радуюць. Да гэтай радасці і імкнуліся людзі ў розныя часы.

Мы можам дакладана выявіць багацце фантазіі беларусаў праз малявакі, бо мудрагелістыя і прадуманыя райскія сусветы захапляюць сваёй незвычайнасцю.

Маляванка – гэта бясконцае імкненне людзей да прыгажосці, да мройнага свету, які яны будавалі ў сваёй свядомасці і адлюстроўвалі ў маляваных дыванах. Кожны элемент не толькі мае сваё значэнне, але і паказвае супрацiў рэчаіснасці і мары. Нездарма аснова маляванкі – гэта чорнае палотнішча, якое, хутчэй за ўсё, падсвядома з’яўляецца адлюстраваннем цемнага, маркотнага жыцця, поўнага працы.

Аналізуючы каноны беларускай народнай творчасці, мы часцей сустракаем нанясенне выяў на светлы фон яркімі ніткамі, фарбамі. Аднак на цёмным лепей вылучаецца святло, як і мары становяцца больш яскравымі, калі яны выплываюць з цемрадзі пакутлівага жыцця. Яскравыя выявы быццам выступаюць з цемры і даюць пэўны запал надзеі і радасці.



*Мал. 1. Невядомы аўтар. “Букет у вазе”*

На дыване (мал.1) мы бачым шлюбны сюжэт: дзьве птушкі, галубы, якія лятуць адзін да адной. Спрадвеку на наша тэрыторыі гэтыя істоты з’яўляюцца сімвалам кахання, пра гэта сведчыць іх прысутнасць у вуснай народнай творчасці, у тым ліку ў песнях, казках. Цэнтр кампазіцыі – букет у кошычку з выявамі розных кветак і красак. Па перыметру дыван упрыгожаны не толькі раслінным арнаментам, але і геаметрычным, на самым крайку. Галоўны прынцып дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва захоўваецца і на гэтым прыкладзе, бо вельмі дакладная сіметрыя прасочваецца ў кэжным элеменце дывана. Колеравая гама яскравая, але вытрыманая. Прасочваецца імкненне да падбору колеру. Пра тое, што гэта шлюбная маляванка сведчыць усё: лятучыя адзін да аднаго галубы, геаметрычны арнамент, які пераплятаецца паміж сабой, як лёсы маладах у шлюбе, чырвоныя ружы, як

асноўны складнік букету, што гаворыць пра любоўную сімволіка дадзенага элементу.

Маляванка з’яўлялася не толькі ўпрыгожваннем але і пасланнем, своеасаблівым лістом, які без слоў, толькі фігуратыўна задаваў зычэнне, калі гэта быў падарунак. Напрыклад, на вясельных дыванах можна вылучыць пэўныя папулярныя сюжэты: маладыя ў чоўне, спакатканне, сімметрычныя выявы птушак і жывёлаў ў атачэнні кветак, выкшталцоныя букеты кветак ці красак.

Маляваныя дываны гілелі ў сціплых інтэр’ерах вясковых хат. Яны пераходзілі з адной эпохі ў іншую, нязменна радуючы і прыцягваючы ўвагу людзей. Беларуская народная мастацкая культура – невычэрпная, жывая крыніца нацыянальнага духу, яго гісторыі і традыцый. Па падобных выявах, якія часта сустракаліся на маляванках у розных рэгіёнах Беларусі, зразумела адзінства менталітэту і светаўяўлення беларусаў, што на поўначы, што на поўдні нашай краіны. Прыкметна, што ганчарная, ткацкая і іншыя рамёствы вельмі адрозніваліся, мелі шмат асаблівасцяў у розных частках нашай Радзімы, а маляванка мела сходны выгляд, свае некранутыя каноны. Магчыма гэта тлумачыцца тымі ж мастакамі-вандронікамі, а можа ўсталяванымі на той час правіламі дэкаратэўна-прыкладнога мастацтва. Нікому не вядома. Зразумела адно: маляваныя дываны – акно ў душу беларуса. Вывучэнне гэтай тэмы дае вялікую базу для аналізу тагачаснага светапогляду людзей.

**Бібліяграфічныя спасылкі**


1. Беларускія маляваныя дываны: альбом-каталог з фондаў гісторыка-культурнага музея-запаведніка "Заслаўе" / [аўтары уступнага артыкула і складальнікі: І.Арцем'ева, Ю.Малаш, А.Рак. – Мінск : Рыфтур, 2005. – 63 с.

2. Народныя маляваныя дываны: вучэбна-метадычны дапаможнік для студэнтаў напрамку спецыяльнасці 1-18 01 01-04 "Народная творчасць (народныя рамёствы)" і спецыяльнасці 1-15 02 01 "Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва (па напрамках)" / Р. Ф. Шаура. – Мінск : БДУКіМ, 2013. – 76 с.

3. О происхождении медальонных композиций маляванок Я. Н. Дроздовича / Коврик Оксана Александровна // Искусство и личность: материалы V Международной научно-практической конференции, 14—15 ноября 2018 года / редкол. : И. И. Рыжикова (отв. ред.) [и др.]. — Минск, 2018. — С. 36—38.

4. Гаранская, Т. Традыцыі развіваюцца / Т. Гаранская // Мастацтва. – 1992. – № 12. – С. 50–52.

5. Маляваныя дываны Любаншчыны. Мастак Павел Марціновіч / І. Ю. Смірнова, С. Г. Выскварка // Мастацтва прымітыву і яго формы ў сучаснай культуры : матэрыялы навукова-практычнай канферэнцыі, якая адбылася ў межах IV Нацыянальнай выставы наіўнага мастацтва "Insita — 2012", прысвечанай 125-годдзю з дня нараджэння Марка Шагала, Віцебск, 4—5 мая 2012 г. / [рэдкалегія: Л. У. Вакар і інш.]. — Мінск, 2013. — С. 95—98.

6. Маляваны рай [Відэазапіс]: [дакументальны фільм: пра лёс і творчую спадчыну беларускай мастачкі Алены Кіш, якая стварала дываны на біблейскія сюжэты з выявай райскага сада] / Нацыянальная кінастудыя "Беларусьфільм", студыя "Летапіс".

7. Гісторыка-культурны музей-запаведнік "Заслаўе" [Выяўленчы матэрыял]: [камплект паштовак] / С. Плыткевіч, фота.